УДК 008.161.3

# МАСТАЦКАЯ ІНТЭРПРЭТАЦЫЯ ПРАБЛЕМЫ СУАДНОСІН КУЛЬТУРЫ І ЦЫВІЛІЗАЦЫІ Ў ТВОРЧАСЦІ У.КАРАТКЕВІЧА

**П.К. Банцэвіч**
УА «Гродзенскі дзяржаўны аграрны універсітэт»
г. Гродно, Республика Беларусь

Духовное наследие В.Короткевича рассматривается в контексте культурологического знания. Проанализированы авторские интерпретации проблемы соотношения культуры и цивилизации, культурологические рефлексии относительно противостояния глобального и этнонационального в культуре.

For the first time V. Korotkevitch's spiritual legacy is considered in the light of cultural sciens and treated not only as literary but as cultural phenomenon. The intentions (images, symbols, projects, intuitions, foresights) of the writer's work are found. They are connected with deep knowledge of peculiarities, traditions and the future of Belarussians culture.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

Літаратура з'яўляецца арганічнай часткай культуры. Сваёй творчай дзейнасцю У.Караткевіч выходзіць за рамкі літаратуры. Ён гісторык і этнограф, культуролаг і мастацтвазнаўца, асветнік і ідэолаг нацыянальнага адраджэння. У.Караткевіч глыбока і востра адчуваў сваё прызначэнне – выводзіць сучаснікаў і нашчадкаў з цяжкага стану сэнсастраты, выкліканай дэвальвацыяй ідэалаў. Занядбанне лепшых традыцый мінулага, выраканне роднай мовы, душэўная аморфнасць – вось далёка няпоўны пералік праблем, што непакоілі пісьменніка. Празаік звяртаў асаблівую ўвагу на тое, што ўзровень духоўнага багацця асобы вызначаецца ступенню культурнай кампетэнцыі, таму імкнуўся дасягнуць павышэння ўзроўню адукаванасці беларускага грамадства, уплываць на развіццё інтэлектуальнай думкі, пашыраць веды пра радзіму і свой народ, далучаць чытачоў да скарбаў айчыннай і сусветнай культуры, спрабаваў спасцігнуць сутнасць этнанацыянальнага духу. Своеасаблівa выказаныя творцам ідэі, рэфлексіі, сімвалы набываюць форму мастацка-вобразнага спасціжэння культуры.

У.Караткевіч у сваёй творчасці аналізаваў праблемы сучаснага грамадства, якому пагражае духоўны апакаліпсіс. Звяртаючыся да праблемы крызісу культуры сярэдзіны XX ст., пісьменнік даследуе мараль, філасофію, мастацтва, імкнецца знайсці карані крызісу ў з'явах духоўнага парадку.Творца адчувае праблему процістаяння культуры і цывілізацыі, пратэстуе супраць стандартаў цывілізацыі, што характэрна для многіх сучасных культуралагічных канцэпцый.

Цывілізацыя – гэта пераход ад творчасці да штампаў, ад унікальнасці да масавай вытворчасці. У.Караткевіч не прымае практыцызму і рацыяналізму XX ст., страты адвечных маральных

каштоўнасцяў, адчужанасці паміж людзьмі: «Так, многія старыя гасцінныя звычаі пакрысе выміраюць, гарадскі чалавек можа часам не ведаць чалавека з суседняга пад’езда»[1, с. 452]. Творца заўважае, што нават адносіны паміж людзьмі набываюць характар суб’ект-аб’ектных, калі індывід губляе здольнасць бачыць і ўспрымаць унутраны свет іншага чалавека, добраахвотна прымае навязаныя яму нормы і стандарты.

На нашу думку, крытыка У.Караткевіча рэчаіснасці блізкая да культуралагічных поглядаў Г.Маркузэ наконт канфармісцкай арыентацыі масавай свядомасці. Індывідуальная свядомасць, запраграміраваная і ўніфікаваная, становіцца аб’ектам накіраванага ўздзеяння, канчатковая мэта якога – прымірэнне чалавека з існуючымі сацыяльнымі умовамі і нормамі паводзін. Аналіз культуролагам механікі вытворчасці «шчаслівай свядомасці» тлумачыць сучаснае становішча філосафаў, інтэлектуалаў, паэтаў. Мастак мусіць быць аднамерным, гэта значыць, думаць і ствараць толькі ў рытме ўстаноўленай функцыянальнай зададзенасці, дзейнічаць толькі ў межах пэўных указанняў, валодаць неўспрымальнасцю маральна-псіхалагічных праблем. У яго не павінна быць памяці, гістарычнай і эмацыянальнай – сферы, дзе магчымыя асацыяцыі, якія арыентуюць на крытычнае ўспрынящце сваёй работы і рэчаіснасці [2, с. 99].

У.Караткевіч прынцыпова змагаўся «супраць стандартызацыі духоўнага жыцця, у чым ён прадчуваў пагрозу і замах на чалавека, яго індывідуальнасць, непаўторнасць, святасць асобы, здольнай тварыць»[3, с. 131]. Ён не мог прыняць партыйнае манапольнае права на рэгуляванне духоўнага жыцця грамадства, у процілегласць інтэрнацыяналістычным дэкларацыям пачаў распрацоўку нацыянальнага пытання, даследаваў спрадвечныя духоўныя каштоўнасці: памяць, культуру, мову. «Вось гэта сапраўдны рэалізм. Мой. І вы ў мяне гэтага майго рэалізму не адбірайце і іншых «ізмаў» мне не торкайце. Ні ў жыцці, ні ў творчасці» [4, с. 124].

У.Караткевіч лічыў, што культура ніколі не была і не будзе абстрактна-чалавечай, яна заўсёды нацыянальная, самабытная і толькі ў такой сваёй якасці ўздымаецца да агульначалавечай. Нацыянальнасць, згодна з М.Бярдзяевым, ёсць пазітыўнае ўзбагачэнне быцця, а творчы нацыянальны дух і ёсць шлях да ўсечалавецтва [5]. У. Караткевіч прытрымліваецца такіх жа пазіцый і таму ў сваіх творах салідна і годна сцвярджае самастойны шлях Беларусі, яе шматлікія прыярытэты і духоўныя набыткі.

На наш погляд, У.Караткевіч бачыць крызіс духоўнай культуры ў наступствах «масавай культуры». «Масавы чалавек» пазбаўлены



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

індывідуальнасці, духоўнасці. Бязлікай, агрэсіўнай масе, якая разбурае культуру, супрацьпастаўляецца эліта, што вылучаецца інтэлектуальнай і маральнай дасканаласцю, гістарычнай ініцыятывай, здольнасцю вырашаць агульнанацыянальныя і агульначалавечыя задачы. Пісьменнік праводзіць паралель паміж селянінам-працаўнікам і цяперашнім нядаўнім гараджанінам, які вельмі спяшаецца засвоіць урбаністычныя здабыткі цывілізацыі ды пераймае найбольш знешнія, прымітыўныя іх праявы. У.Караткевіч не пакідае па-за ўвагай той факт, што культурнае асяроддзе пражывання спрыяе станаўленню духоўна багатай асобы ці, наадварот, садзейнічае яе збядненню: «Не тая ўжо і вёска. Людзі носяць не тыя ўборы, глядзяць замест батлейкі тэлевізары. Яны жывуць нязмерна лепей, але і падабней адзін да аднаго»[1, с. 385]. Ідэі мастака карэлююць з канцэпцыямі М.Бярдзяева, О.Шпенглера, якія сцвярджаюць, што асабісты пачатак раскрываецца толькі ў культуры, тады як цывілізацыя абязлічвае асобу, пазбаўляе арыгінальнасці [6; 7].

Шэрасць і аднатыпнасць, паводле пісьменніка, наўрад ці здолеюць развіць у моладзі творчае ўспрыманне свету, эстэтычны густ. Аўтар стварае дэталёвую карціну побыту продкаў, каб падкрэсліць багацце духоўнага свету беларусаў. Ён жадае, каб маладое пакаленне пазбегла аднастайнасці думак, абыякавасці да беларускага, непаўторнага: «Чаму я апісваю вам гэта? А таму, што ежа розных народаў, як і вопратка і жыллё, усё больш падпадае стандарту. І ў Маскве, і ў Кіеве, і ў Мінску, у хаце і ў сталоўцы – паўсюль вы ясце тыя ж самыя катлеты ды біфштэксы, носіце тыповыя вопраткі з падобных матэрыялаў, усё больш забываеце непаўторнасць і адметнасць жыцця той мясціны, адкуль вы родам. А да канца забываць пра гэта нельга»[1, с. 404]. Праз гэтыя радкі выяўляецца праблема цывілізацыйнага, глабальнага і этнанацыянальнага.

У.Караткевіч праводзіў інтэнсіўную навучальную і выхаваўчую работу, скіраваную на інтэлектуальнае, духоўнае станаўленне будучых грамадзян краіны («Зямля пад белымі крыламі»). Яго вельмі турбавала тое, што сярод значнай часткі моладзі пашыраліся кепскі густ, вузкасць духоўных інтарэсаў, слабае валоданне нацыянальнай мовай і няведанне культурнай спадчыны. Мастак прывівае чытачам любоў да ўсяго роднага, каб цанілі і шанавалі: «Любіце гэтую сваю святую зямлю аддана і да канца. Іншай вам не дадзена, дый непатрэбна»[1, с. 570]. Гэта любоў, паводле У. Караткевіча, павінна ісці не толькі ад сэрца, але і ад розуму, з выразным разуменнем таго, што зроблена народам. Дзеля гэтага трэба ўсвядоміць, што ў беларусаў існуе свая адметная культура высокага ўзроўню: «Размова пойдзе пра тыповае, пра тое,



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

што розніць побыт беларуса ад побыту, скажам, грузіна ці ўкраінца» [1, с. 392]. Пісьменнік знаёміць чытачоў з асноўнымі аспектамі жыццядзейнасці беларусаў, з сямейным і грамадскім побытам, пакідае ў душы глыбокі эмацыянальны след, дае шанц адчуць повязь часоў. Мастак дэталёва адлюстроўвае здабыткі матэрыяльнай і духоўнай культуры народа. Жыллё, прылады працы, адзенне і прадметы побыту – усё звяртае нашую ўвагу не толькі прадуманасцю, зручнасцю ў карыстанні, але і зграбнасцю формаў, самабытнасцю аздаблення. Творца ўхваляе тонкі мастацкі густ народа, сцвярджае векавое імкненне беларусаў жыць па законах прыгажосці. Этнагарафічныя веды тут вельмі карысныя, бо яны фарміруюць пачуццё нацыянальнай годнасці, этнакультурную самаідэнтыфікацыю, спрыяюць пераемнасці культуры. К.Гірц адзначаў, што этнаграфічнае апісанне інтэрпрэтуе сацыяльны дыскурс. Так рэалізуецца магчымасць пранікнення даследчыкам у «карціну свету» вывучаемага народа і дыялогу з ім [8]. У такім кірунку дзейнічаў У.Караткевіч. Творца апісвае беларускія вёскі як асяродкі ўтульнага і прыстойнага жыцця. Вёска з яе векавым укладам, трываласцю, гармоніяй з прыродай у пісьменніка з'яўляецца альтэрнатывай гораду. Мастак адлюстроўвае жыццё паміж вёскай і горадам, супастаўляе традыцыі народнай культуры і сучаснай масавай субкультуры. Найбольшую трывогу У.Караткевіча выклікала праблема зберажэння народнай культуры, захавання самабытнасці. Пісьменнік шкадаваў, што нацыянальныя традыцыі для сучаснікаў як нешта адасобленае, мёртвае, і людзі не заўважаюць, што існуюць на руінах: «Хата, двор, абстаноўка робяцца ўсё больш аднолькавыя. Даўно ўжо сталі звычайнымі халадзільнікі, пральныя машыны, матацыклы. Над хатамі – крыжы тэлевізійных антэн. Усё гэта добра і радасна, але часам не шкодзіла б зберагчы частку старой непаўторнасці, часам хочацца бачыць старыя хаты хаця б музеі пад адкрытым небам, часам на хвіліну абуджаецца сум і хочацца ўпрыгожыць хату непаўторным старым ручніком або даматканай посцілкай» [1, с. 415].

Бясспрэчным падцверджаннем сувязяў У.Караткевіча з сацыякультурным вопытам этнасу стала арыентацыя мастака на фальклор. У рэцэпцыі вуснай народнай творчасці пісьменнік бачыў дзейсны маральна-дыдактычны сродак, трывалую жыццёвую аснову. Цікавасць да культуры свайго этнасу, што праяўлялася ў даследаваннях фальклору і звычаяў, у паказе «мясцовага каларыту» у мастацтве, была характэрная для рамантычнай плыні 1-й паловы XIX ст., звязанай з праблемай вывучэння «народнага духу» (браты Грым, браты Шлегелі, Л.Цік). Апрацоўваючы вусную народную творчасць, У.Караткевіч прагнуў вярнуць беларусам іх уласны духоўны скарб,



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

узбагаціўшы яго не толькі індывідуальна-мастацкім, але і сацыякультурным вопытам народа. Фальклорнымі парадыгмамі творца падкрэсліваў таленавітасць беларусаў, трываласць у пераемнасці культу дзядоў. Пісьменнік настойліва раіў выкарыстоўваць каштоўныя маральныя прынцыпы фальклору для асветы, выхавання людзей. Праз вусную народную творчасць сучасны чытач набывае магчымасць пранікнуць у духоўную атмасферу старажытнасці, паверыць у свае творчыя сілы.

У 2-й палове ХХ ст. праблема фальклору набыла нечуваныя раней антынамічнасць і драматызм. У выніку татальнай індустрыялізацыі і ўрбанізацыі разбураліся важныя звенні народнай культуры. Чалавека, арыентаванага на сцвярджэнне спрадвечных каштоўнасцяў, шпарка выцясняе сучасна аднабокі прафесіянал-утылітарыст з  канфармісцкай арыентацыяй на спажыванне і моду. У.Караткевіч адчуваў гэтую праблему і таму вузкаспецыфічная, на першы погляд, тэма пра месца фальклору ў сістэме сучаснай культуры набывае ў яго творчасці шырокае сацыяльнае значэнне, суадносіцца з праблемай выхавання чалавека сучаснага грамадства і фарміравання сістэмы яго каштоўнасцяў. Пісьменнік намагаецца  зрабіць шматвяковыя здабыткі культуры багаццем душы сучасніка, пераадолець спажывецкія, утылітарысцкія тэндэнцыі, шукае, што можна супрацьпаставіць масавай эрзац-культуры, якая бярэ ў палон усё новыя рэгіёны.

Пісьменнік садзейнічаў фарміраванню экалагічнай культуры і выхаванню экалагічнай свядомасці праз актыўную грамадзянскую пазіцыю, якую ён займаў у вырашэнні глабальнай праблемы «Чалавек, прырода, цывілізацыя». Вялікую ролю ў пераадоленні погляду на прыроду як на просты аб’ект чалавечых маніпуляцый адыграла універсальная этыка (Г.Тор, М.Гандзі, А.Швейцар). Яе важнейшы пастулат заключаецца ў сцвярджэнні неабходнасці распаўсюджання сферы чалавечай этыкі  на ўсё прыроднае, бо прадстаўнікі прыроды з’яўляюцца такімі ж паўнапраўнымі суб’ектамі, як і чалавек [9, с. 361]. Гэтыя ідэі знаходзяць усё больш прыхільнікаў сярод вучоных розных галін навукі: эколаг О.Леапольд, культуролаг Г.Гачаў, філосаф В.Хесле. У.Караткевіч працягваў гэту традыцыю. А.Мальдзіс адзначае, што «У.Караткевіч быў першы, хто ў Беларусі стаў біць трывогу, прадбачучы экалагічныя крызісы» [10, с. 99]. Супярэчнасці паміж цывілізацыяй і натуральным светам непасрэдна адбіваюцца на маральным вобліку сучасніка, ставяць перад кожнай асобай шмат псіхалагічных пытанняў. Пісьменнік спрабуе адлюстраваць дысанансы ў навакольным ассяроддзі, выявіць змены ў душы чалавека, які страціў



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

меру разумнасці ў адносінах з жывой прыродай: «Чалавек запраграміраваны для свежай вады, абмытай дажджом зяляніны, чыстага паветра. І таму калі мы хоць у дробязі нявечым адзіную, раз і назаўсёды нам дадзеную біясферу – мы нявечым саміх сябе»[4, с. 276]. Творцу надзвычай хвалюе, што неразумныя адносіны да прыроды робяць чалавека празмерна рацыяналістычным, чэрствым, эгаістычным. Страціўшы адчуванне хараства натуральнага свету, чалавек пераўтвараецца ў бяздушную «цывілізаваную» істоту. У.Караткевіч нагадвае, што навука і тэхніка, якія робяць чалавека магутным, бязмерна павышаюць яго адказнасць за ўсё, што ён робіць:«А я ж толькі хацеў папярэдзіць: атам – магутная, карысная, але і небяспечная сіла.» [10, с. 17]. Пасля горкага ўроку Чарнобыля, словы публіцыста набываюць асаблівую актуальнасць.

Аксіялагічныя і пазнавальныя падыходы да вырашэння праблем развіцця нацыянальнай і агульначалавечай культуры; інтэнцыі (вобразы, інтуіцыі, пошукі, праекты, ідэі) карэлююць ў творах пісьменніка са зместам шэрагу тэорый, канцэпцый класічнай і сучаснай культуралогіі. Інтэнцыянальны масіў культуралагічнай спадчыны У.Караткевіча актуалізуе праблемы суадносін масавага і элітарнага ў культуры (Х. Артэга-і-Гасэт), агульначалавечага і нацыянальнага (М. Бярдзяеў), культурнага і цывілізацыйнага (О. Шпенглер). У.Караткевіч абмяркоўвае пытанні аб лёсе і своеасаблівасцях нацыянальнай культуры, аб прычынах яе росквіту і ўпадку. Мастак сцвярджае, што беларуская культура ўнікальна, мае свае жыццё, волю, свае сімвалы, выяўляецца ў адметных архітэктурных, мастацкіх, моўных, філасофскіх формах. Культуралагічны змест творчасці У.Караткевіча дэтэрмінуецца пошукам глыбінных асноў быцця беларускай культуры, яе сэнсавобразаў і перспектыў развіцця.

Літаратура


1. Караткевіч, У. Збор твораў: У 8 т. / У. Караткевіч. – Мінск: Маст. літ., 1987-1991. – Т.8. У 2 кн. Кн.1: П’есы. Нарыс. – 590 с.
2. Маркузе, Г. Эрос и цивилизация. Одномерный человек: Исследование идеологии развитого индустриального общества / Г. Маркузе. – М.: АСТ, 2002. – 526 с.
3. Калеснік, У. Усё чалавечае: Літаратурныя партрэты, нарысы / У. Калеснік. – Мінск: Маст. літ., 1993. – 381 с.
4. Караткевіч, У. Збор твораў: У 8 т. / У. Караткевіч.– Мінск: Маст. літ., 1987-1991. – Т.8. У 2 кн. Кн.2: З жыццяпісу, нарысы, эсэ, публіцыстыка, постаці, крытычныя творы, інтэрв’ю, летапіс жыцця і творчасці. – 495 с.
5. Бердяев, Н.А. Творчество и объективация / Н.А. Бердяев. – Минск: Экономпресс, 2000. – 304 с.
6. Бердяев, Н.А. Философия свободы: Смысл творчества / Н.А. Бердяев. – М.: Правда, 1989. – 607 с.




РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

7. Шпенглер, О. Закат Европы / О.Шпенглер. – Новосибирск: ВО Наука, 1993. – 572 с.
8. Гирц, К. Влияние концепции культуры на концепцию человека / К. Гирц // Антология исследований культуры. – СПб.: Университетская книга, 1997. – 406 с.
9. Самерсова, Н.В. Проблема экологии сознания / Н.В. Самерсова // Прырода, чалавек, культура: праблемы гармоніі: Матэрыялы навук. канф., Мінск, 25-26 сакавіка. 2003 г. – Мінск: Бел. дзярж. ун-т культуры, 2003. – С. 358-363.
10. Мальдзіс, А. Жыццё і ўзнясенне Уладзіміра Караткевіча: партрэт пісьменніка і чалавека / А. Мальдзіс. – Мінск: Маст. літ., 1990. – 229 с.

УДК 316.7

# ТОЛЕРАНТНОСТЬ КАК ФАКТОР ОПТИМИЗАЦИИ МЕЖКУЛЬТУРНОГО ДИАЛОГА

**Т.Н. Боярчук**
УО «Гродненский государственный университет им. Янки Купалы»
г. Гродно, Республика Беларусь

В статье анализируется особенность процесса межкультурной коммуникации как неизбежной встречи культурных систем, в процессе которой встает вопрос возникновения противостояния «своего» и «чужого». В своих размышлениях автор придерживается диалогического подхода в осмыслении культуры, понимаемой как диалог исторических, этнических и социальных особенностей, в рамках которого происходит становление самосознания человека. Автор показывает необходимость формирования и существования толерантного сознания, мышления, образа жизни и поведения людей в поликультурном пространстве для реализации оптимального диалога культур.

The article analyses the special feature of process intercultural communication as inevitable meeting cultural systems, when the question of opposition “Our” and “Foreign” came up in the society. In the situation of total multicultural world it is necessary to search the model of peaceful coexistence different subcultures. The author analyses dialogue approach to culture as dialogue historical, ethnical and social characteristics, where the formed of itself mentality. Analyses about of peaceful coexistence, author emphasizes to inevitable the form and existence tolerance as mode of life peoples in the multicultural world for the realization of optimal the dialogue of culture.

На рубеже XX – XXI вв. перед обществом встала проблема взаимодействия культур. Сегодня эта проблема приобретает все более глобальный характер и становится все более значимой.

Современные технологии и средства коммуникации позволяют человеку непосредственно знакомиться с особенностями и ценностями других культур. С первых контактов с этими культурами люди быстро убеждаются, что представители этих культур по-разному реагируют на внешний мир, у них есть свои особенности, системы ценностей и нормы поведения, которые существенно отличаются от принятых в их родной культуре. В ситуации расхождения или несовпадения каких-либо культурных явлений другой культуры с принятыми в «своей» культуре возникает понятие «чужой». Тот, кто сталкивается с чужой



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ